філфаку БДУ Ірыне Крук, якая знайшла гэтае слова ў *„Беларускай Драматычнай Майстроўні“* — аматарскай тэатральнай студыі, што існавала ў Вільні ад 1922 да 1925 году, папулярызавала нацыянальную тэатральную культуру ды спыніла сваё існаваньне ў выніку рэпрэсіяў з боку польскіх уладаў, а таксама праз матэрыяльныя цяжкасьці. Сярод кіраўнікоў віленскай *майстроўні* — імёны Арсеня Канчэўскага і Леапольда Родзевіча.

*Майстроўня* 80-ых таксама зазнала на сабе перасьлед, цяпер ужо савецкіх уладаў, якія нават у самім слове *майстроўня* бачылі прыкметы нядобранадзейнасьці. У адрозьненьне ад „добранадзейнай“ майстэрні, *майстроўня*, дзякуючы нязвыкламу суфіксу -оў-, рабілася падазронай — больш беларускай.

# Макарона

***Сяргей Харэўскі***

Беларусы ведалі локшыну, але гэта была рэдкая страва, найперш з прычыны браку пшанічнае мукі. *Макарона* — ня локшына, ейны выраб патрабуе найлепшае мукі, тлустага малака, адмысловых апаратаў. Гэткія магчымасьці зьявіліся ў Беларусі толькі ў 60-я гады, калі запрацавалі *макаронныя фабрыкі* ў Віцебску, Барысаве і Слуцку.

Акурат у гэты час за Беларусяй была замацаваная роля бульбянога поля СССР. Грэчка і гарох спачатку пачалі прападаць з палеткаў, пасьля з прылаўкаў. Іх замяніла *макарона*, паводле калярыйнасьці роўная мясу. Неад'емнай часткаю мэню стала *„макарона па-флёцку“* — сумесь *макароны* з тушанінаю. Гэтую гіпэркалярыйную страву спажывалі цяпер ня толькі маракі з субмарынаў Запаляр'я, але й беларускія дзеці і іх бацькі. Чым бяднейшыя былі людзі, тым больш налягалі яны на гэты танны і калярыйны прадукт. Беларускі пралетарыят заўважна патлусьцеў.

Сёньня беларусы забываюцца пра *макарону*. Айчынная — дрэннай якасьці, імпартная — дарагая. *„Макарона па-флёцку“* цяпер згадваецца ў мінулым часе. На радасьць дыетолягам.

# Макулятура

***Сяргей Дубавец***

*Макулятура* — гэта скарыстаная і прызначаная для перапрацоўкі папяровая прадукцыя. Старыя газэты, непатрэбныя кнігі, ведамасьці, сшыткі, абгорткі зьбіраюць у стосы, перавязваюць вяроўкай і здаюць — *на макулятуру*. Кабета-прыёмшчыца ставіць вашыя пакункі на вагу і, падлічыўшы на костках, расплочваецца грашыма або нейкімі гаспадарчымі рэчамі, напрыклад, туалетнай паперай.

Кожны, каму даводзілася быць у савецкіх піянэрах і школьніках, ведае, што такое *збор макулятуры* — сапраўднае сацыялістычнае спаборніцтва паміж клясамі за тое, хто здасьць болей, калі дзеля перамогі ў пакункі старых часопісаў вязаліся нават лепшыя тамы з бацькоўскай бібліятэкі. Самыя важкія былі, натуральна, энцыкляпэдычныя тамы. І ўсё дзеля чаго? Для хуткаплыннае славы — нейкай ганаровай граматы, якую са зьменаю пакаленьняў чакаў той самы *макулятурны* лёс.